БЫВАЙ ГОД 2000-ы, ВІТАЕМ НОВАЕ СТАГОДДЗЕ!

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

№ 19 (993) | ЧАЦВЕР, 28 снежня 2000 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная



С пожеланьем счастья и любви
И во всем задуманном везенья,
Пусть подарит этот Год Змеи
Смех и радостное настроенье,
Пусть всегда удача будет рядом,
Вам успех и мудрость принесет,
Пусть друзья поддержат теплым взглядом —
Самым лучшим станет Новый Год!

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры фізічнага выхавання і спорту горача віншуюць дацэнта названай кафедры **МЯДЗВЕДЗЕВА Валерыя Анатольевіча** з паспяховай абаронай дысертацыі на спецыялізаваным Савеце Акадэміі фізічнай культуры і спорту на атрыманне вучонай ступені доктара педагагічных навук.

***

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты матэматычнага факультэта горача віншуюць загадчыка кафедры вышэйшай матэматыкі дацэнта **СЕМЕНЧУКА Уладзіміра Мікалаевіча** з паспяховай абаронай дысертацыі на спецыялізаваным Савеце пры ГДУ на атрыманне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук.

***

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты філалагічнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры беларускай мовы **ХАЗАНАВУ Кацярыну Львоўну** (навуковы кіраўнік — прафесар У.В.Анічэнка) з паспяховай абаронай дысертацыі на спецыялізаваным Савеце пры універсітэце на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

## У НАВАГОДНЮЮ КАЗКУ

**запрашаюць Дзед Мароз і Снягурачка дзяцей выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Іх чакае сустрэча з казачнымі героямі, карагод вакол лясной прыгажуні-ёлкі, призы за выкананыя вершы, песенькі, танцы.**

**Ранішнік пачнецца ў 11 гадзін 30 снежня ў фае актавай залы вучэбнага корпуса №1.**

**ПРАФКОМ.**

## ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

Мы — на парозе эпахальнай падзеі: у гісторыю адыходзіць 2000-ы год, якім завяршаецца дваццатае стагоддзе. Яно для чалавецтва было самым насычаным і бурным у прамым і шырокім разуменні гэтых слоў. Сказанае тычыцца ўсіх сфер жыццядзейнасці зямлян, у тым ліку развіцця адукацыі і навукі.

Больш дзвюх трэціх цяперашняга стагоддзя прыпадае на пройдзены шлях нашай вышэйшай навучальнай установай — вядучай на Беларускім Палессі. Сёння яе здабыткі не паддаюцца дакладнаму падліку, але з упэўненасцю можна сказаць, што яны вельмі важкія і шматзначныя. Агульнапрызнана, што наш універсітэт даўно стаў сапраўднай кузняй падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў для многіх галін народнай гаспадаркі, навуковым і культурна-асветніцкім цэнтрам свайго рэгіёна, навучальнай установай, якая славіцца паспяховымі выступленнямі сваіх мацнейшых спартсменаў на спаборніцтвах самага высокага ўзроўню, уключаючы летнія Алімпійскія гульні.

Яркія радкі ў летапіс універсітэта ўпісаны сёлета. У асобе ганаровага рэктара ГДУ доктара ф.-м.н., прафесара, заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь, члена-карэспандэнта НАН Беларусі Л.А.Шамяткова, які ўдастоены сярэбранага медаля "2000 выдатных вучоных XX стагоддзя", прысуджанага Міжнародным Біяграфічным Цэнтрам (г.Кембрыдж, Вялікабрытанія), наш універсітэт набыў яшчэ больш шырокае міжнароднае прызнанне. Таксама адметным з'яўляецца тое, што рэктар ГДУ прафесар, заслужаны работнік адукацыі краіны М.В.Селькін абраны членам Савета Рэспублікі Нацыяльнага сходу Рэспублікі Беларусь. За выдатны ўклад у развіццё вышэйшай адукацыі краіны загадчыкі кафедр, дактары навук, прафесары І.В.Максімей і А.А.Станкевіч у ліку ста лепшых вучоных ВНУ рэспублікі ў бягучым навучальным годзе будуць атрымліваць персанальныя надбаўкі да заработнай платы ў памеры 30 тарыфных ставак першага разраду.

Праз тры дні мы ўступім у XXI стагоддзе і ў новае тысячагоддзе. Для кожнага з нас гэтыя крокі стануць не толькі памятнымі, але і вельмі хвалюючымі. Усе мы па-сапраўднаму заклапочаны аб сваёй будучыні. Дык няхай для кожнага з нас яна застанецца мірнай, стане больш светлай і шчаслівай.

Моцнага ўсім здароўя, дабрабыту, плённай працы і выдатнай вучобы для росквіту нашай Радзімы!

**РЭКТАРАТ, ПРАФКОМ, ПРАФКОМ СТУДЭНТАЎ.**

## ВЫДАТНЫ ПАЧЫН

Прыемная навіна прыйшла з канадскага мястэчка Блэккомб, дзе праходзіў этап Кубка свету па фрыстайлу (лыжнай акрабатыцы). Упершыню ў гісторыі развіцця гэтага віду спорту на вышэйшую прыступку п'едэсталу гонару ўзнялася беларуская спартсменка — першакурсніца завочнага аддзялення факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта Ала Цупер.

Віншуем Алу з гэтым поспехам і жадаем ёй быць на такім жа ўзроўні і ў новым годзе.

Думкамі дзеліцца член Савета Рэспублікі

## ПРАБЛЕМ ШМАТ. ВЫРАШАЦЬ ІХ СУПОЛЬНА

**Сярод васьмі членаў Савета Рэспублікі, якія прадстаўляюць Гомельшчыну ў верхняй палаце Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання, - рэктар нашага універсітэта прафесар М.В.Селькін. Гутарку з ім прапануем увазе нашых чытачоў.**



**- Міхаіл Васільевіч, перш за ўсё дазвольце шчыра павіншаваць Вас з высокім давер'ем - абраннем у Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь новага склікання.**

- Вялікі дзякуй. Прызнаюся: для мяне гэта было зусім нечакана. Зразумейце правільна: зусім нядаўна, а дакладней, на прадвесні, я быў прызначаны на пасаду рэктара вядучай ВНУ Беларускага Палесся. Працы і паўсядзённых клопатаў тут - ад ранку і да позняга вечара. І вось дадатковая, яшчэ больш адказная нагрузка. Так што давядзецца дзейнічаць у самым, што ні ёсць, максімальным рэжыме. Гэтым самым у поўнай ступені здолею апраўдаць ускладзеныя на мяне спадзяванні прэзідыума Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў і Гомельскага гарадскога выканаўчага камітэта, вылучыўшых, і сумеснага пасяджэння дэпутатаў гарадскіх і раённых Саветаў, абраўшых мяне ў Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання.

**- Чым адметны Ваш жыццёвы шлях?**

- Пастаянным імкненнем да ведаў і дасягненнем пастаўленых мэт. Родам я з г.Веткі. Тут закончыў сярэднюю школу з залатым медалём, а затым з чырвоным дыпломам матэматычны факультэт Гомельскага дзяржуніверсітэта. Пэўны час выкладаў матэматыку і фізіку ў сельскай школе. Адслужыў у радах Савецкай Арміі.

**(Заканчэнне на 2-й стар.)**

## СТЫПЕНДЫЯТЫ ФОНДУ ПРЭЗІДЭНТА

РАСПАРАДЖЭННЕМ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ЗАЦВЕРДЖАНА РАШЭННЕ САВЕТА СПЕЦЫЯЛЬНАГА ФОНДУ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ ПА САЦЫЯЛЬНАЙ ПАДТРЫМЦЫ АДОРАНЫХ НАВУЧЭНЦАЎ І СТУДЭНТАЎ ДЗЯРЖАЎНЫХ ВНУ АБ НАЗНАЧЭННІ ІМ СТЫПЕНДЫЙ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Ганаровага права атрымліваць такія стыпендыі па выніках сёлетняй вясновай залікова-экзаменацыйнай сесіі ўдастоены і два прадстаўнікі нашага універсітэта: чацвёртакурсніца факультэта замежных моў спецыяльнасці "Англійская мова" **Таццяна Сеніна** і трэцякурснік эканамічнага факультэта спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне вытворчасцю" **Сяргей Каморнікаў**. Такім чынам адзначана іх выдатная вучоба на працягу ўсіх студэнцкіх гадоў, плённая навукова-даследчая дзейнасць, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці.

Напярэдадні Новага года на факультэтах ва ўрачыстай абстаноўцы ім былі ўручаны пасведчанні спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Думкамі дзеліцца член Савета Рэспублікі

# ПРАБЛЕМ ШМАТ. ВЫРАШАЦЬ ІХ СУПОЛЬНА

**(Заканчэнне. Пачатак на1-й стар.)**

Тры дзесяцігоддзі майго жыцця звязаны з навукай, педагагічнай дзейнасцю ў ГДУ. Па заканчэнні аспірантуры працаваў старшым выкладчыкам кафедры алгебры і геаметрыі, дацэнтам, прафесарам, намеснікам, а затым дэканам матэматычнага факультэта, прарэктарам па вучэбнай рабоце, першым прарэктарам. Дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук абараніў у 1977 годзе, доктара фізіка-матэматычных навук - у 1998 г. У 1991 г. мне было прысуджана вучонае званне прафесара, а ў 1997 г. - ганаровае званне "Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь". Я абраны членам-карэспандэнтам Беларускай акадэміі адукацыі, з'яўляюся старшынёй Савета рэктараў Гомельскай вобласці.

**- Дарэчы, услед за Вамі пайшлі ў навуку спачатку жонка, а затым і сын.**

- Гэта так. Жонка, Людміла Антонаўна, стала кандыдатам эканамічных навук, працуе дацэнтам кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю. Сын, Вадзім, працягвае маю справу. Ён - кандыдат фізіка-матэматычных навук, алгебраіст.

**- Вы, Міхаіл Васільевіч, цяпер у адказе за стан спраў не толькі ў сваім універсітэце, а, ў поўным сэнсе слова з'яўляецеся своеасаблівым куратарам як вышэйшай школы, так і ўсёй адукацыі нашай Гомельшчыны. Якія, на Ваш погляд, у гэтай вельмі важнай галіне найбольш востра стаяць праблемы і што трэба зрабіць у першую чаргу, каб закласці падмурак для іх паспяховага вырашэння?**

- Павінен сказаць, што перш за ўсё мяне хвалююць пытанні рэгіянальнай палітыкі ў адукацыі і выхаванні падрастаючага пакалення. У прыватнасці, расходуюцца значныя сродкі на дубліраванне спецыяльнасцей у розных ВНУ. Няма цэнтралізацыі ў фінансаванні навуковай праблематыкі. Адсутнічае належная кааперацыя ў сістэме вышэйшай школы па падрыхтоўцы вострадэфіцытных спецыялістаў для нашага рэгіёна. У адукацыйных установах не распрацавана дакладная канцэпцыя ідэйна-выхаваўчай работы незалежна ад іх прыналежнасці - дзяржаўнай або прыватнай. Патрэбны больш дакладны кантроль за рэформай школы. Не ўсё яшчэ вырашана і з працаўладкаваннем выпускнікоў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

Многа ў нас задач, звязаных з наступствамі Чарнобыльскай катастрофы. Гэта і многае іншае патрабуе велізарных сродкаў. Таму кожны працаўнік адукацыйнай сферы павінен праяўляць выключную ашчаднасць і самааддачу на займаемай пасадзе. Паспяхова вырашаць неадкладныя пытанні і праблемы можна толькі сумеснымі намаганнямі.

**- Ваш позірк на перспектыву.**

- Думаю, што недалёка той час, калі ў рэспубліцы вырашацца нарматыўна-прававыя пытанні жыццядзейнасці прамысловасці, будаўніцтва, сельскай гаспадаркі і прадпрымальніцтва. Самае ж галоўнае, што трэба зрабіць, - гэта каб з кожным днём нашым людзям станавілася лепш жыць, каб цікавей і больш прадукцыйна ім працавалася, часцей іх твары свяціліся ўсмешкай і назаўсёды знік сум.

**- Якой пазіцыі будзеце прытрымлівацца ў верхняй палаце парламента краіны?**

- Як член Савета Рэспублікі суверэннай Беларусі, я цвёрда прызнаю прыярытэт агульна-дзяржаўных праблем і перакананы, што яны не могуць правільна вырашацца на аснове ўшчамлення рэгіянальных інтарэсаў. Буду супрацьстаяць спробам іх ігнаравання. Разлічваю на разуменне, падтрымку і салідарнасць усіх дэпутатаў Нацыянальнага сходу ад Гомельшчыны. Лепшымі ў заканадаўчай дзейнасці Савета Рэспублікі лічу тыя законы, якія не абцяжарваюць, а з'яўляюцца асновай, стымулююць прыняцце эфектыўных і, галоўнае, рэальна ажыццяўляльных рашэнняў рэгіянальнымі органамі дзяржаўнай улады.

**- Жадаем Вам, Міхаіл Васільевіч, поспехаў у ганаровай і вельмі адказнай парламенцкай місіі ў надыходзячым XXI стагоддзі. Дзякуй за гутарку.**

- Удзячны ўзаемна. Карыстаючыся выпадкам, шчыра віншую з надыходзячым новым 2001 годам і новым тысячагоддзем усіх чытачоў газеты. Усяго вам найлепшага, шаноўныя сябры!

**Гутарку вёў Ул.БАЛОГА.**

ШКОЛА – УНІВЕРСІТЭТ

# СУВЯЗЬ ТЭОРЫІ З ПРАКТЫКАЙ



У студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей важным этапам у вучобе з'яўляецца практыка ў школе. Ім неабходна прыйсці ў класы з пэўным багажом метадычных ведаў па выкладанню таго ці іншага прадмета.

У чацвёртакурснікаў матэматычнага факультэта педпрактыка яшчэ наперадзе – у другім вучэбным семестры. Але можна сказаць, што актыўная падрыхтоўка да яе пачалася ўжо зараз. Дацэнт кафедры матаналізу С.І.Чарток, якая чытае ім курс па методыцы выкладання матэматыкі, арганізавала для іх цікавае знаёмства з настаўнікамі-прадметнікамі СШ № 27 г.Гомеля. Студэнты змаглі наведаць урокі, якія вялі Л.Ф.Каралёва, А.А.Жыхарава, Г.М.Азяўчыкава, В.А.Каламіец, адчуць на канкрэтных прыкладах цесную сувязь атрыманай імі на лекцыях тэорыі з практыкай.

Са студэнтамі сустрэлася таксама дырэктар школы Я.А.Азяўчыкава, якая расказала аб яе лепшых вучнях, выпускніках, цікавых мерапрыемствах, якія праводзяцца па традыцыі ў СШ №27. Так, у прыватнасці, тут захоўваецца прыз "Яблык пазнання", які ўручаецца на навучальны год адной са школ вобласці за самых выніковых удзельнікаў алімпіяды. Сёлета лепшым з іх стаў Аляксей Данчанка (выхаванец к.т.н М.С.Далінскага, начальніка інфармацыйна-вылічальнага цэнтра ГДУ), які тройчы ўдзельнічаў у міжнародных алімпіядах па інфарматыцы, наведаў Партугалію, Турцыю, Кітай, двойчы прывозіў са спаборніцтваў сярэбраныя медалі. Цяпер ён – студэнт БДУ. У школе створаны два музеі: яго гісторыі і баявой славы. Ёсць яшчэ і кабінет гісторыі рэлігіі. Да гадавіны вызвалення г.Гомеля праводзяцца дэкада гісторыі, сустрэчы з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, маці воінаў-афганцаў.

Шмат цікавага пачулі будучыя педагогі і ў час размовы з В.А.Лапацінай, настаўніцай пачатковых класаў, якая стала лаўрэатам конкурсу "Настаўнік года – 2000", з'яўляецца членам зборнай настаўнікаў Гомельшчыны, удзельнікаў міжнароднага конкурсу ў г.Палтава.

Сустрэча са школай, дзе працуюць сапраўдныя прафесіяналы, існуюць выдатныя выхаваўчыя традыцыі, дала студэнтам разуменне таго, што прафесія, абраная імі, вельмі адказная і патрабуе вялікай самааддачы.

За актыўную работу са студэнтамі кафедра матаналізу, дэканат матэматычнага факультэта універсітэта аб'явілі падзяку дырэктару і настаўнікам СШ № 27.

На будучае плануецца наладжваць сустрэчы педагагічнага калектыву школы са студэнтамі і ва універсітэцкіх аўдыторыях.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

# "БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРА Ў ДЫЯЛОГУ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ"



Пад такой назвай нядаўна ў г. Мінску прайшла другая сесія III-га міжнароднага кангрэсу беларусістаў, у якой прынялі ўдзел каля 500 навукоўцаў з Расіі, Украіны, Беларусі, Польшчы, краін Балтыі, ЗША, Славакіі, Чэхіі, Венгрыі і інш.

Яго арганізатарамі былі Міжнародная асацыяцыя беларусістаў, рэспубліканскія міністэрствы адукацыі, культуры, замежных спраў, НАН Беларусі, Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Ф.Скарыны, ЮНЕСКА.

На пленарным і секцыйным пасяджэннях удзельнікамі кангрэсу заслуханы і абмеркаваны шматлікія даклады – аб перспектывах развіцця беларусістыкі ў свеце, адраджэнні нацыянальнай свядомасці ў суполках, умацаванні і пашырэнні культурных узаемаадносін паміж краінамі свету, фарміраванні дзяржаўнай і нацыянальнай свядомасці беларускага народа ў параўнанні і ўзаемадзеянні з аналагічнымі працэсамі ў суседніх краінах і інш.

Ад ГДУ ў рабоце кангрэсу прынялі ўдзел дацэнты кафедры беларускай літаратуры В.С.Новак, якая выступіла з дакладам "Аб сучасных асаблівасцях бытавання фальклорна-міфалагічнай спадчыны Палесся", і В.К.Шынкарэнка (яна прадставіла тэзісы свайго даклада "Рака Каліноўшчыны ў беларускай і суседніх літаратурах"). На другой секцыі з дакладам "Клопаты Масквы і Варшавы ў сувязі з акадэмічнай канферэнцыяй 1926 года" выступіў дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі Р.Р.Лазько.

Удзельнікі кангрэсу прыйшлі да высновы аб важнасці далейшага паглыблення дыялогу паміж краінамі свету ў сферах мовы і культуры.

# ЗА ДАПЫТЛІВЫ РОЗУМ І ТАЛЕНТ

**Год 2000-ы для Уладзіміра Сапажкова, першакурсніка фізічнага факультэта ГДУ, стаў асабліва памятным і знамянальным. Як трохразовы чэмпіён рэспубліканскай алімпіяды па фізіцы, аўтар двух патэнтаў на вынаходніцтвы, ён у ліку 50 юных вундэркіндаў Гомельшчыны стаў лаўрэатам прэміі спецыяльнага фонду абласнога выканаўчага камітэта па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў. Урачыстае ўзнагароджанне адбылося ў грамадска-культурным цэнтры, і віншавалі маладыя таленты старшыня аблвыканкама М.Р.Вайцянкоў, начальнік упраўлення адукацыі А.В.Лук'яновіч.**



... 16-гадовага Валодзю ў Гомельскім аддзяленні Беларускага таварыства вынаходнікаў і рацыяналізатараў сустрэлі з усмешкай і лёгкай іроніяй. Прапанову юнака паглядзець яго малюнкі-чарцяжы ротарнага рухавіка ўнутранага згарання і рычажнай падвескі аўтамабіля, у якія ён заклаў ідэі ўдасканальвання, работнікі таварыства спачатку сур'ёзна не ўспрынялі. Аднак, пры больш уважлівым знаёмстве з ім іх іранічны настрой змяніўся на практычны: рацыянальныя зярняткі рэканструкцыі рухавіка, што называецца, самі кідаліся ў вочы. Нічога не заставалася, як прызнаць ідэі юнага "Кулібіна" вынаходніцтвам і аформіць потым адпаведнымі дакументамі.

А пачыналася ўсё вельмі празаічна. Пасля дзевятага класа Валодзя праводзіў летнія канікулы ў бабулі ў вёсцы, што на Браншчыне. І неяк так атрымалася само сабой, што ў вольную хвіліну прыйшла ў яго галаву думка пра той рухавік, як падоўжыць яго тэрмін службы. Хуценька зрабіў на паперы малюнкі-накіды і потым яшчэ цэлы год выношваў ідэю ў галаве, пакуль не дапрацаваў усё да лагічнага канца.

Са школьных гадоў Уладзіміру Сапажкову было "цеснавата" ў рамках вучэбнай праграмы. Дапытлівы розум юнака прагнуў шырыні ведаў, асабліва ў дакладных навуках – фізіцы, матэматыцы. Таму пасля выдатнага заканчэння васьмі класаў СШ №40 г. Гомеля падаў дакументы ў гарадскі ліцэй. Немалую ролю ў гэтым выбары адыграў прыклад яго старэйшага брата Віталія, які закончыў вучобу ў гэтым жа ліцэі і стаў потым студэнтам электратэхнічнага факультэта БелДУТа. Атмасфера дэмакратычнасці і ў той жа час строгай патрабавальнасці за ўзровень ведаў з боку выкладчыкаў давалі ліцэістам магчымасць найбольш поўна праявіць свае здольнасці. І Уладзімір стараўся выкарыстаць гэта з поўнай аддачай. Яго ўдзел у першай алімпіядзе па фізіцы, якая праводзілася тут, у ліцэі, прынесла яму поспех, пасля чаго юнак трапляе на абласную алімпіяду сярод школ, дзе займае другое месца і атрымлівае адпаведны дыплом. З часам раслі яго дасягненні ў рэспубліканскіх алімпіядах, што праходзілі ў Брэсце, Гродна. Да ранейшых узнагарод дабаўляюцца Дыпломы І ступені, залаты медаль, а таксама падзячнае пісьмо мэра г. Гомеля А.С.Якабсона за высокія вынікі ў вучэбна-пазнаваўчай і творчай дзейнасці, грашовыя прэміі. Гэта дало Уладзіміру права (дарэчы, аднаму з усяго яго выпуску), не здаваць выпускныя экзамены ў ліцэі. У.Сапажкова залічваюць членам рэспубліканскай каманды для ўдзелу ў міжнароднай алімпіядзе па фізіцы ў Вялікабрытаніі.

Пасля заканчэння ліцэя з сярэбраным медалём Уладзімір атрымаў запрашэнне працягваць вучобу на фізічным факультэце у МДУ, БДУ. А ён спыніў свой выбар на спецыяльнасці "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі" фізічнага факультэта нашага універсітэта, бо і інфарматыка, якую ў ліцэі выдатна выкладалі, яму падабалася не менш за фізіку. Студэнтам ГДУ ён стаў аўтаматычна, адразу пасля здачы дакументаў у прыёмную камісію. Той момант, калі яго павіншавалі з залічэннем і сказалі "Чакайце выкліку", ён добра запомніў, бо быў шчаслівы яшчэ і ад таго, што літаральна напярэдадні вярнуўся з Мінска, куды як лепшы вучань ездзіў на баль выпускнікоў рэспублікі, які наладзіў для іх Прэзідэнт Беларусі.

Непрыкметна праляцеў для Уладзіміра першы навучальны семестр у ГДУ. Вучоба ўсё так жа лёгка даецца яму, бо ёсць трывалая база ведаў, закладзеная не толькі стараннасцю, адказнасцю, але і дапытлівым розумам, талентам юнака. І верыцца, што яшчэ шмат перамог чакае наперадзе Уладзіміра Сапажкова.

**Т.ДУБЯК.**
**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

# АБ'ЯЎЛЕНА ПАДЗЯКА МІНІСТЭРСТВА

За актыўную работу ў забеспячэнні поўным інфармацыйным, рэкламным і прыстэндавым матэрыялам, шырокую рэкламу навукова-тэхнічных распрацовак і вялікі асабісты ўклад у падрыхтоўку экспазіцый 3-й Міжнароднай выстаўкі "Вузаўская навука, прыборы, тэхналогіі, матэрыялы, праграмнае забеспячэнне", якая праходзіла на базе Беларускага дзяржаўнага універсітэта, загадам па Міністэрству адукацыі Рэспублікі Беларусь аб'яўлена падзяка супрацоўнікам ГДУ – інжынеру-матэматыку ІВЦ А.В.Карнейчуку, м.н.с.НДС А.П.Кавалёву, вядучаму інжынеру-патэнтазнаўцу НДС М.Ф.Ярмалкевічу.

ЭТО ИНТЕРЕСНО

# ИСТОРИЯ ДЕДА МОРОЗА И НОВОГОДНЕЙ ЕЛКИ



Дед Мороз - один из самых молодых героев новогодних празднеств (коляд). Он "родился" в XIX веке. В конце XIX - начале XX веков появился обычай дарить детям подарки от имени Деда Мороза, а позднее - и Снегурочки.

Однако и елка, и Дед Мороз, хотя и были новыми, "импортными", элементами Коляд, тем не менее заключали в себе очень древнюю, славянскую и даже индоевропейскую языческую символику.

"Игрища", приурочивавшиеся к зимней солнечной фазе, представляли собой 12-дневный заклинательный комплекс. Люди встречали поворот солнца к будущей весне. В конце декабря в связи с зимним солнцестоянием наши предки на высоком месте - на холме или возвышенном речном берегу - зажигали с помощью трения священный, "живой" огонь, который горел шесть дней в конце старого года и шесть дней в начале нового года.

Малые священные огни зажигались внутри жилищ. Для них выбирался огромный чурбан хвойного дерева, который тлел весь ритуальный срок. Новогодняя елка в новое время своими свечами и разноцветными лампочками символизирует древний сакральный огонь.

Елку, кстати, ставили в углу на возвышении и укрепляли на крестообразной подставке ("кресте"). Этот крест - также далекий образ древнейшего знака огня и символ солнца.

Настоящая новогодняя елка немыслима без украшений и карнавальных костюмов. Шары и игрушки - белочки, зайчики, мишки в наше время - не более чем элемент эстетики, а ряженье воспринимается как забава, игра. Однако и в этих элементах новогоднего праздника заключена древнейшая символика. Вторые шесть дней праздника солнца были "велесовыми днями", связанными с культом Велеса (Волоса), "скотьего бога", божества всего племенного богатства, охотничьих и скотоводческих благ. Первые же шесть колядных дней посвящались будущему урожаю. Именно поэтому на ритуальном огне испекались тестяные крестики и рогатые лепешки, поджаривались зерна пшеницы, ячменя, ржи и бобовых культур. Зерна и лепешки частью съедались в день выпечки, а частью оставлялись на день сева или отдавались скоту.

Подарки, которые сегодня кладут под елку, являющуюся символом колядного очага, продолжают в модифицированном виде традицию одаривания колядными хлебными зернами и лепешками, которые, по поверьям, обеспечивали, в частности, рост и здоровье детей.

Новогодние подарки приносит Дед Мороз. Основой образа доброго старика с бородой, в шубе и валенках, с волшебным посохом явился распространенный на Западе сказочный персонаж - святой Николай, который в день своего праздника (6 декабря) одаривал и детей, и взрослых. Постепенно святой Николай превратился в Санта-Клауса (**Санта** - "Святой", **Клаус** - разговорная форма имени Николай).

Образ старика, являющегося в канун Нового года, обязательно окрашен в национально-культурные тона. Наш Дед Мороз похож на Санта Клауса лишь внешне - высоким ростом, своей красной шубой и шапкой, седой бородой. По сущности же, по имени родной Дед Мороз - это олицетворение сил природы в восточнославянском языческом мировосприятии. Повелитель холодов, северных ветров и снежных буранов, Мороз, Морозко, Мороз Морозович или Мороз Иванович почитался славянами с очень древних времен.

Мороз Иванович подарков никому не дарил. В разных местностях его представляли по-разному: либо как сурового старика с длинной белой бородой, либо как маленького старичка, либо как могучего богатыря или кузнеца, сковывающего "железными холодами" реки и озера. Накануне Зимних Святок, чтобы утихомирить, умиротворить Мороза, его "кормили". Хозяин дома или кто-нибудь из старших выходил за порог и предлагал Морозу ложку киселя или кутьи со словами: "Мороз! Мороз! Приходи кисель есть. Мороз! Мороз! Не бей наш овес".

К XIX веку образ Мороза претерпел изменения в результате соприкосновения с иной, западноевропейской культурной традицией. Но остались его изначальные функции (хозяин вьюг и метелей) и его исконное имя, **Дед Мороз.**

**Александр РОГАЛЕВ,**
**доктор филологических наук.**

НЕЗАБЫЎНЫЯ ІМГНЕННІ ФЕСТЫВАЛЮ

# А ТАЛЕНТАЎ ТАК ШМАТ...









**Здаецца, толькі-толькі прагучалі апошнія акорды "Арт-сесіі", якая ў сярэдзіне восені ўладарыла ў нашым універсітэце, на розных сцэнічных пляцоўках г.Гомеля, а ўжо 2000-ы год адлічвае свае апошнія дзянькі. Але ў памяці ўсіх удзельнікаў фестывалю яшчэ надоўга застануцца яго самыя яркія і цікавыя старонкі, канцэрты, сустрэчы, знаёмствы...**

**На гэтых здымках — толькі чатыры фрагменты шырокай праграмы свята творчасці і дружбы. Але і яны дастаткова яскрава сведчаць, як шмат талентаў сярод моладзі розных краін, як мастацтва моцна з'ядноўвае яе. І ў тым, што фестываль збярэ старых і набудзе новых сяброў у наступным, XXI стагоддзі, сумненняў няма.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

# ПАД НОВЫ ГОД ШТО НЕ ПАЖАДАЕЦЦА!..

Па-свойму арыгінальна і непаўторна сустрэла Новы год уся вялікая студэнцкая сям'я інтэрната № 1 нашага універсітэта. Нямала давялося папрацаваць пры падрыхтоўцы свята культарганізатару В.М.Варонінай, выхавацелю А.Л.Хадановічу, усяму студэнцкаму аргкамітэту. Новы год — гэта заўсёды радасць, вяселле, свята, ад якога застаюцца толькі цёплыя ўспаміны. Таму і праграма свята была разнастайная, з цікавымі конкурсамі, з салодкімі прэзентамі і памятнымі падарункамі, з традыцыйнымі Дзедам Марозам і Снягуркай з усёй казачнай світай, з дыскатэкай...

Кажуць, што ўсё пажаданае пад Новы год збываецца. Вось і студэнцкая сям'я інтэрната вельмі б хацела, каб былі створаны ў памяшканні інтэрната своеасаблівы радыёвузел з праведзенымі на паверхах гучнагаварыцелямі. Такім чынам пасляуніверсітэцкае жыццё ў інтэрнаце зрабілася б найбольш цікавым. Уявіце сабе віншаванні з днём нараджэння ад сяброў і суседзяў, лёгкую музыку, загады адміністрацыі, якія каменданту не трэба шмат разоў даводзіць да кожнага. Спрасцілася б і прапускная сістэма для наведвальнікаў. Ёсць знаёмыя з гэтай справай студэнты, ды, напэўна, і сродкаў патрэбна не надта багата. Чакаем рашэння адміністрацыі універсітэта.

Напрыканцы ж хочацца пажадаць усім менш сутыкацца з цяжкасцямі ў новым стагоддзі, быць аптымістычнымі, бадзёрымі, здаровымі і шчаслівымі.

З Новым годам, сябры!

**Сяргей АРЦЁМАЎ,**
**студэнт гр. БА-33**
**філалагічнага**
**факультэта.**

# "ВЯСЕЛЛЕ"... У БІБЛІЯТЭЦЫ

Сёння мы назіраем тэндэнцыю да адраджэння народных звычаяў і абрадаў, мабыць, таму, што ўласна беларускія рытуалы насычаны глыбокай мудрасцю, самабытнасцю і яскравасцю. Вяселле ж захоўвае і прадстаўляе ўсе найбольш характэрныя рысы беларусаў.

Беларускае вяселле — тэатралізаваны спектакль, народная опера, адзін з самых старажытных абрадаў. Непаўторным хараством мовы, багаццем міфалагічных уяўленняў, паэтычнасцю душы народнай адрозніваюцца вясельныя традыцыі Гомельскага Палесся.

Менавіта ўсе гэтыя якасці паспрыялі таму, што наша група БЖ-12 філфака разам са сваім куратарам дацэнтам кафедры беларускай літаратуры В.С.Новак вырашыла інсцэніраваць і паказаць гледачам найцікавейшыя фрагменты беларускага вяселля.

І калі нам прапанавалі перад выступленнем на сваім факультэце паказаць наша свята ў гарадской бібліятэцы № 11, дзе адбылася прэс-канферэнцыя з творчымі работнікамі перыядычных выданняў, мы з задавальненнем згадзіліся.

На сустрэчу прыйшлі прадстаўнікі газет "Гомельская праўда", "Савецкі раён", "Вячэрні Гомель", "Народная газета" і інш. Кожны з іх расказваў аб спецыфіцы працы ў сваіх выданнях.

У зале прысутнічалі прыхільнікі перыядычнага друку, чытачы бібліятэкі і тыя, каму праца карэспандэнта здаецца блізкай да сэрца. І ўся гэта аўдыторыя мела магчымасць запытаць гасцей аб тым, што іх найбольш хвалюе: ці то справы моладзі і яе будучыня, ці то нацыянальная самасвядомасць і пытанне білінгвізму ў краіне і інш. І ніводнае пытанне не засталося без адказу.

А напрыканцы гутаркі вядучая аб'явіла гледачам аб выступленні з інсцэніроўкай вяселля студэнтаў філфака спецыялізацыі "Літаратурная работа ў газетах і часопісах". Апладысментамі сустракалі гледачы такія цікавыя фрагменты вясельнага абраду, як рада ў бацькоўскай хаце, сватанне, заручыны, дзяльба каравая і інш.

З інсцэніроўкай вясельнага абраду студэнты выступілі потым і на сваім факультэце.

**Ірына МАЛАКОВІЧ,**
**Кацярына БАЙДАКОВА,**
**студэнткі гр. БЖ-12**
**філалагічнага**
**факультэта.**

# ВЯРТАЛІСЯ СТУДЭНТЫ З ЗАНЯТКАЎ ...

**Загадам па універсітэту аб'яўлена падзяка трэцякурснікам юрыдычнага факультэта Міхаілу Пагуляеву, Сяргею Высоцкаму і Ігару Яцко за высокі ўзровень правасвядомасці, выкананне грамадзянскага абавязку, што праявілася ў рашучых дзеяннях па затрыманню злачынцы.**

А справа была так...

Восеньскім днём вярталіся студэнты дамоў з заняткаў і каля універмага "Гомель" пачулі крыкі жанчыны аб дапамозе. Даведаўшыся ў яе, што здарылася, хутка зрэагавалі на сітуацыю. Шляхам падману невядомы мужчына завалодаў замежнай валютай жанчыны і спрабаваў збегчы. Юнакі змаглі яго затрымаць і даставілі ў міліцыю. Высветлілася, што ён раней ужо быў асуджаны. Цяпер злачынец прыцягнуты да крымінальнай адказнасці па арт. 90 КК Рэспублікі Беларусь.

Юрыст — прафесія адказная, нялёгкая, часам звязаная з рызыкай. У гэтым упэўніліся на канкрэтнай сітуацыі студэнты ГДУ — будучыя работнікі праваахоўных органаў.



**Николай МЕНЬШАКОВ**

## *ХРУСТАЛЬНЫЙ ЗВОН*

Бокала звон хрустальный,
Далеких предков звон;
Поющий голос дальний -
Живым от них поклон.

Поклонимся былому,
Сединам дорогим,
И очагу родному...
Пригубим, помолчим.

Как колокол призывный,
Бокал с вином звенит.
Пусть этот тост заздравный
Всегда и всех пленит.

За Новый год! Столетье,
Его священный зов!
За здравие и счастье,
За верность, за любовь!

*Из истории слов*

## ЗМЕЯ ... ВОВСЕ НЕ ЗМЕЯ

Ничего не подозревая, мы зовем змею... змеей. А на самом деле она и не змея вовсе. Слово это возникло значительно позже древнего названия этого пресмыкающегося и появилось в результате запрета, табу: опасное имя ползучей гадины было заменено описательным "ложным" именем. Старое название исчезло и не дошло до нас.

В русский язык это слово пришло в виде старославянского "змий". Оно было родственно слову "земь" — "земля" и буквально означало "ползающий по земле".

## ОЧЕНЬ ДАЖЕ СИМПАТИЧНЫЙ ЗНАК

По представлениям народов Дальнего Востока о символике двенадцатилетнего "звериного" цикла календаря, ЗМЕЯ - очень даже симпатичный знак. Рожденным под знаком Змеи (1953, 1965, 1977, 1989) присущи следующие личностные качества: романтичность, интеллект, красота, мудрость.

Хотите умных и красивых детей? Нет проблем, целый год впереди. Лучшие брачные партнеры Змеи - солидный, терпеливый, проницательный Буйвол (Бык, Корова - 1961, 1973, 1985) или откровенный, хвастливый, мечтательный Петух (Курица - 1969, 1981). Неудачный вариант - Обезьяна (1968, 1980), совершенное несчастье - Тигр (1974, 1986) или Свинья (1971, 1983). Остальные - так себе.

***

**В культурной традиции Ближнего Востока змея зачастую выступает как коварный искуситель: достаточно вспомнить библейского змия. С другой стороны, змея выступает как символ мудрости - фоборо (змея, кусающая себя за хвост). Ношение кольца в виде фоборо придает владельцу или владелице мудрость. Не забудьте только, что у пальцев рук тоже есть своя символика:**

большой - разум;

указательный - хватка, деловитость;

средний - упорство;

безымянный или сердечный - дела сердечные, любовь и брак (недаром по представлениям античных медиков к этому пальцу выходил капилляр прямо от сердца).

Так что на каждый случай - свой вариант. Тем более, у студентов сессия на носу. А любовь всегда в сердце - даже у внешне холоднокровных, но таких обаятельных Змей.

**К.ЛАПКИН, наш собственный корреспондент на Востоке.**

*Проявите фантазию*

## НОВОГОДНЯЯ КОМПОЗИЦИЯ



Главным украшением Новогодних и Рождественских праздников являются растения. В Японии в новогоднюю ночь у входной двери ставят икебану из веток сосны, розы, листьев бамбука, цветов сливы как пожелание вечной молодости и долгой жизни. В скандинавских странах на стенку вешают ветку омелы белой. Обычай украшать дом новогодней елкой берет начало с обычая древних германцев встречать перелом зимы (22 декабря) ветками хвойных деревьев в качестве символа пробуждающейся природы и вечной жизни.

В настоящее время в новогодний праздник вырубается очень много молодых деревьев из семейства сосновых - сосен, елей, пихт. Однако размеры хвойного дерева требуют соответственных масштабов мест, где их устанавливают.

В небольшом помещении широко используются новые виды аранжировок - елочки-букеты, елочки-миниатюры. Для их создания достаточно нескольких веточек ели или сосны, туи, пихты, кипариса. К ним добавляют живые срезанные цветы или в горшках. Особенно нарядны елочки-букеты с гвоздиками или розами. К веткам хвойных растений можно добавлять также ветки кустарников с ягодами (рябина, барбарис, калина), шишки, сухие цветы, листья комнатных растений (папоротник, аспарагус, хлорофитум). Эффектным дополнением могут быть фрукты, свечи, конфеты, мишура, фигурки гномиков, деда мороза, снегурочки. В композициях обычно используют не все сразу, а два-три элемента. Подставками для миниатюрных елочек могут быть блюда, подсвечники, всевозможные вазы, даже обычное яблоко.

Если помещение совсем маленькое, отлично украсят миниатюрный столик две-три веточки хвойного дерева и "свеча" из шишки ели или сосны. Ее можно подкрасить золотой или серебряной краской. Основание шишки укрепляют в кусочек пенопласта, а между чешуйками шишки помещают маленькие сухие цветочки или кусочки фольги, мишуры. На вершине шишки укрепляют "пламя" - фонарик физалиса.

Очень популярны также подвесные и настенные композиции с использованием веток хвойных, шишек, елочных игрушек. Это Рождественские венки и гирлянды, обручи, подвесные шары и "люстры".

Какая бы ни была по конструкции композиция, самое главное, чтобы в ней присутствовали изящество, пропорциональность, радостное настроение, чтобы она сохраняла красоту природного материала, вносила тепло и уют, создавала праздничный фон.

**Р. МАРКЕЛОВА, доцент кафедры ботаники и физиологии растений.**

**На снимке: работа автора.**

# ГОД ЗМЯІ – 2001



*Крыху гісторыі*

У Расіі большасць гадоў Змяі XX стагоддзя адзначаліся моцнымі грамадскімі ўзрушэннямі. Адзначым, што яны заўсёды былі звязаны з абстрактнымі ідэямі, якія авалодвалі масамі. Так, у 1905-м магічным словам была "свабода", у лютым 1917-га - "дэмакратыя", у кастрычніку 1917-га - "дыктатура пралетарыята", у 1929-м - "усеагульная калектывізацыя". У 1941-м мы былі захоплены адной ідэяй - выстаяць і пераламаць хрыбет фашысцкаму зверу. У 1989-м насельніцтва рэспублік СССР захапіла ідэя суверэнітэту і нацыянальнай незалежнасці, якая прывяла да распаду Савецкага Саюза. Былі, аднак, і тры адносна спакойныя гады Змяі - 1953-і (год вызвалення ад сталінскага прыгнёту), 1965-ы (першы год тады яшчэ спакойнага брэжнеўскага перыяду) і 1977-ы (прынята апошняя савецкая Канстытуцыя).

*Год Змяі - сапраўднае свята для модніц!*

Новыя мадэлі, як правіла, аблягаюць фігуру; будуць адрозніваццa выдумкай і зграбнасцю. Аблюбаваным колерам будзе серабрысты, а тоны іншых колераў стануць пераліваццa металічным адценнем. Не выключаюцца матэрыялы ў касую клетачку, асабліва для панчох, накідак, хустак і хустачак.

*Як сустракаць год Змяі*

Усюды, дзе толькі можна, трэба выкарыстаць змяіную сімволіку - хвалістыя лініі, кольцы, узоры ў клетачку. Стальной Змяі адпавядаюць белы і серабрысты колер і бліскучая біжутэрыя. Жаночае адзенне павінна падкрэсліваць лініі цела і адначасова быць поўным фантазіі. Падыдуць брошкі, заколкі і бранзалеты ў выглядзе змеек, з агульным стылем будуць гарманіраваць хвалістая прычоска і яркія пазногці чырвоных ці фіялетавых адценняў, якія кантрастуюць з адзеннем.

Жанчына павінна быць каралевай навагодняга вечара. У Японіі параўнанне "прыгожая, як змяя" - адзін з лепшых кампліментаў у адрас жанчыны! З мужчын запытанне меншае. Яны павінны быць акуратна і чыста апрануты (асаблівая ўвага - бляску чаравікаў), іх гальштук павінен імітаваць расфарбоўку і фактуру змяінай скуры.

*Навагодні стол*

Няхай ён будзе разнастайным, але недарагім: Змяя - праціўніца марнатраўства і паказнога шыку.

Да напояў яна абыякавая, выступае за ўмеранасць. Удзельнікі застолля, якія перапілі, абражаюць годнасць Змяі, а гэтага яна не даруе і помсціць жорстка.

Музычнае афармленне свята павінна быць мяккім: флейта, скрыпка, працяжная песня. Змяя не пераносіць ірваных рытмаў джаза і барабаннага бою.

*Што абяцае год Змяі кожнаму знаку ўсходняга задыяка*

(У дужках пералічаны гады нараджэння, якія можна працягнуць у абодва бакі, прыбаўляючы ці аднімаючы па 12).

ДЛЯ ПАЦУКА (МЫШЫ) (...1948-60-72...) - у дзелавых адносінах не вельмі ўдалы год. Аднак вы можаце дасягнуць вялікага поспеху ў творчай працы, музыцы, мастацтве і літаратуры. Выгодны год для напісання мемуараў і вершаў. Не гаварыце шчыра з Канём, Малпай і Сабакам! Выберыце сабе ў сябры Буйвала, Ката (Зайца, Труса) і Дракона.

ДЛЯ БУЙВАЛА (БЫКА, БІЗОНА) (...1949-61-73...) - удача ў справах, але праблемы ў сямейным жыцці. У гэтым годзе яму не рэкамендуецца мяняць шлюбнага партнёра і ўвогуле браць шлюб. У сваіх дзеяннях яму трэба ўстрымлівацца ад прымянення насілля. Трымайцеся далей ад Змей, Коней і Коз, сябруйце з Пацуком, Свіннёй і Катом!

ДЛЯ ТЫГРА (...1950-62-74...) - напружаны дзелавы год. Каб не страціць сваіх пазіцый у жыцці, ён павінен пазбягаць бяздзейнасці і ляноты, пашыраць сферу свайго ўплыву. Добра спалучаць справы з паездкамі і падарожжамі, можна адправіцца ў працяглую экспедыцыю. Не ўступайце ў цесны кантакт з Малпай, Пеўнем і Сабакам, сябруйце з Катом, Драконам і Змяёй.

У КАТА (ЗАЙЦА, ТРУСА) (...1951-63-75...) - прадуктыўны год. Асабліва добры ён для людзей гуманітарных прафесій - журналістаў, філосафаў, выкладчыкаў, пісьменнікаў. Не трэба толькі блізка да сэрца прымаць сямейную здраду. Пазбягайце Малпы, Пеўня і Сабакі, сябруйце з Драконам, Канём і Казой.

У ДРАКОНА (...1952-64-76...) у год Змяі - аўтарытэт, грошы, прасоўванне па службе, каханне, адкрывае магчымасці бліснуць сваімі добрымі якасцямі. Цудоўны год! Не трэба толькі захапляцца беспадстаўнымі авантурамі. Можаце цалкам давяраць Змяі, Тыгру і Кату і трымайце вуха востра ў стасунках з Буйвалам, Пеўнем і Малпай.

ДЛЯ ЗМЯІ (...1953-65-77...) - вельмі добры год, прычым, чым ён цяплейшы, тым лепш. Здзяйсненне жаданняў, поспех у справах, захапляльныя любоўныя прыгоды. У складаных сітуацыях заўсёды знойдзецца бяспечнае выйсце. Толькі не трэба ўступаць у канфлікт з законам! Гармонія вам забяспечана ва ўзаемаадносінах з Казой, Змяёй і Сабакам. Трымайцеся падалей ад Пацука, Буйвала і Свінні.

ДЛЯ КАНЯ (...1954-66-78...) - цяжкі год. Шмат з таго, што прыйдзецца вам рабіць, здасца недарэчным і немэтазгодным, а зрабіць па-свойму не будзе магчымасці. Давядзецца прызвычайвацца! Верагоднае вялікае, але нядоўгае каханне, таму нічога не варта прыносіць яму ў ахвяру. Сябруйце з Казой, Змяёй і Драконам, пазбягайце Пацука, Буйвала і Свінні.

У КОЗАЎ (БАРАНОЎ) (...1955-67-79...) нямала прычын для радасці: год абяцае шмат цікавых заняткаў і плётак, даходы з нечаканай крыніцы, папулярнасць у грамадстве. Але не варта вельмі ўжо адкрыта цягнуць коўдру на сябе і пасвіцца ў чужым агародзе! Лепшыя сябры - Змяя, Конь і Сабака. Верагодныя непрыяцелі - Буйвал, Малпа і Свіння.

ДЛЯ МАЛПЫ (...1956-68-80...) год Змяі спрыяльны. Вы добра ўпісваецеся ў грамадства, займаецеся карыснай і прыбытковай справай, у многіх пытаннях проста неабходныя. Аднак не дайце апанаваць сябе гордасці! Кааперыруйцеся з Пеўнем, Сабакам і Свіннёй, не давярайце Змяі, Каню і Казе.

У ПЕЎНЯ (КУРЫЦЫ) (...1957-69-81...) чакаецца неспакойны год. Узнікнуць нечаканыя праблемы, толькі справішся з адной - усплывае другая... Але разнастайнасць сітуацый падтрымлівае цікавасць да жыцця. Найбольш дакучлівай уяўляецца сямейная праблема. Дружыце з Малпай, Драконам і Сабакам, пазбягайце Буйвала, Змяі і Каня.

ДЛЯ САБАКІ (...1958-70-82...) год Змяі нядобры. Сабака нешчаслівы, таму што не разумее сам сябе. Але ў рэшце рэшт яго азарыць адкрыццё, і ў наступны год ён пяройдзе ў новым, больш высокім духоўным узроўні. У бытавых жа адносінах жыццё яго будзе ісці, як і ішло, без асаблівых адкрыццяў. Падтрымку ён знойдзе ў Сабакі, Змяі і Свінні, апасацца трэба Ката, Дракона і Пеўня.

У СВІННІ (КАБАНА) (...1959-71-83...) у наступным годзе - фінансавы поспех і нешанцаванне ў каханні, але ў цэлым больш непакою, чым радасці. Свае пачуцці ёй лепш трымаць у цуглях. У дзелавой сферы будзе рэгулярна шанцаваць, калі розум не заслоняць эмоцыі. Сябраваць лепш з Пацуком, Буйвалам і Драконам, а пазбягаць - Змяі, Тыгра і Пеўня.

☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺

## ЮМОР ИЗ МЕШКА ДЕДА МОРОЗА

*В гостях*

*За новогодним столом не ешьте и не пейте слишком громко, так как вы привлечете этим внимание к понравившемуся вам блюду. Может не хватить добавки.*

***

*Перед десертом обязательно позаботьтесь об окружающих и дайте несколько добрых медицинских советов: мороженое ведет к ангине, чай вреден для почек, от кофе бывает инфаркт и т.п*


**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

- гісторыі Беларусі — дацэнта;
- тэорыі і практыкі англійскай мовы — заг. кафедры;
- тэарэтычнай фізікі — дацэнта;
- оптыкі — прафесара, дацэнта;
- заалогіі і аховы прыроды — дацэнта;
- геалогіі і разведкі карысных выкапняў — дацэнта;
- рускай літаратуры — асістэнта.

**Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.**

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.

РЭКТАРАТ.



Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Песіна, 80, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 705
Падпісана да друку 26.12.2000